Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 18 Вільня, Пятніца 16 Трауня 1930 г. Год VI (XIV).

Беларуская КРЫНІЦА

Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі: ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19) Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. да 4 гадз. веч.

„Бел. КРЫНІЦА“ каштуе на год—6 зл., на паўгода — 3 зл., на 3 месяцы — 2 зл.. ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Цана абвестак: на 1-шай старонцы 60 гр., 2 і 3 — 50 гр.. на 4-ай — 40 грш. — за радок дробнага друку ў аднэй шпальце

Усе Беларусы мужчыны і жанчыны

з паветаў: Лідзкага, Ашмянскага, Маладэчанскага, Вялейскага, Валожынскага і Шчучынскага —

галасуюць 25 трауня (мая) на свой спісак № 18

У справе выбараў.

Ужо недалёка дзень 25 трауня, калі жыхары Лідзкага вокругу пойдуць споўніць свой абавязак і ўкінуць у выбарную скрынку картачку з нумарам паводле свайго найлепшага разуменьня. Першыя выбары прайшлі для лепшай часткі беларускага жыхарства ў паветах: Вялейскім, Маладэчанскім, Ашмянскім, Валожынскім і Лідзкім нездаваляюча. Прычынай гэтага нездаваленьня было скасаваньне 18-ткі і адабраньне гэтым у народу магчымасьці выявіць сваю волю.

Цяпер-жа справа прадстаўляецца інакш. Цяпер дана магчымасьць галасаваць за 18-тку і мы пэўны, што беларускі народ дружна пойдзе да выбарных урнаў з восемнасткай у руцэ. Людзі, якія прыяжджаюць з вёскі, а такжа і тыя, якія выяжджаюць на вёску, прывозяць радасныя весткі аб вялікім беларускім усьведамленьні і аб волі народу галасаваць на 18-тку. Але нашыя ворагі стараюцца перашкодзіць гэтаму і, калі ўжо ня могуць зьбіць з толку ўсьведамленых грамадзян, дык падыходзяць да няўсьведамленых з такімі нагаворамі: няварта сусім ісьці на выбары, бо гэта бескарысна, усё адно гэтыя выбары нічога не дадуць, бо могуць быць новыя, а можа сойму і сусім ня будзе і г. д. Такімі славамі некаторыя панкі хочуць адцягнуць ад выбараў нашага селяніна.

Гавораць гэтак перадусім тыя, якія стаяць блізка да ўрадавых кругоў. Ім, бачыце, не на руку гэтыя выбары, яны нават ня выставілі свайго сьпіску, бо баяліся праваду, дык цяпер намаўляюць і іншых, каб устрымаліся ад галасаваньня. А калі людзі ўстрымаюцца і ня пойдуць на выбары, тады ў іх будзе іншая гутарка. Тады яны скажуць: а што? ці мы не казалі, што народ ня хоча выбараў? А раз народ ня хоча выбіраць, дык і сойму ня трэба, абыйдземся без яго.

Вось як будуць гаварыць тыя, што цяпер адмаўляюцца ад выбараў. Дык для кожнага сьведамага Беларуса няхай будзе ясным, што на выбары трэба ісьці, трэба пакацаць перад усім сьветам, што мы жывём і дабіваемся лепшай долі. Увесь палітычны сьвет будзе сачыць за рэзультатамі выбараў у Лідзкім вокрузе і наагул на ўсходніх абшарах Польшчы, дзе жывуць Беларусы і Украінцы, з вялікім зацікаўленьнем, дык рэзультат выбараў будзе мець аграмаднае палітычнае значэньне.

Калі мы прыглядзімся да ўсіх сьпіскаў у Лідзкім вокрузе, дык убачым сьпіскі польскія, беларускія, адзін расейскі і адзін жыдоўскі.

На польскія сьпіскі ніхто з сьведамых Беларусаў галасаваць ня будзе. Знача—ніхто ня будзе і не павінен галасаваць на нумар 2. — P. P. S., 3—Вызваленьне, 10 — Стронніцтво хлопске, 25—эндэцыя, 43—сьпісак нейкага польскага эканома. Усе гэтыя сьпіскі польскія і яны нясуць загубу беларускаму народу, бо яны насылаюць на нас цэлыя хмары асаднікаў і каляністаў з этнографічнай Польшчы і яны стараюцца спаляніваваць наш край. Гэтыя партыі кажуць, што ў этнографічнай Польшчы цесна, а ў нас „прасторна“, дык дзеля гэтага яны хочаць перасяліць сюды частку свайго народу. Забываюцца яны, што і ў нас часам ужо ня можна з бараной акруціцца, ня хочуць такжа ведаць, сколькі ў нас малазямельных і беззямельных! А найбольш стараюцца калянізаваць наш край тыя, якія прыкідаюцца найбольшымі прыяцелямі нашага народу: стронніцтво хлопске (нумар 10) і вызваленьне (нумар 3). Не адстае ад іх і P. P. S. (нумар 2), не гаворачы ўжо аб эндэцыі (нумар 25). А той эканом з нумару 43, дык хоча найхутчэй зямлі для сябе.

Два сьпіскі нібы беларускія такія слабыя, што аб іх і гаварыць няварта. Яны выстаўленыя на тое, каб баламуціць сялян і разьбіваць беларускія галасы. Такія напрыклад „панна стэфанія Глебовічувна“ з Валожыншчыны сабрала на прошлых выбарах 1928 г. аж 37 галасоў.

На сьпіску нумар 45 стаіць слаўны спадар Янка Станкевіч, які за верную лякайскую службу патраціў ужо купіць 600 дзесяцін зямлі (сам ён прызнаецца толькі да 200). Гэты здраднік не павінен прайсьці ў сойм беларускімі галасамі, някай яго выбіраюць палякі, калі ён ім так верна служа.

На сьпіску нумар 46 стаяць людзі, якім падабаецца камуна, калектывы, камісарская ўлада. Яны ідуць да таго, каб закабаліць нашага селяніна і зрабіць з яго дзяржаўнага парабка, каб пазакрываць цэрквы, касьцёлы, каб адабраць ад селяніна яго карэўку, коніка і загнаць у калхозныя баракі. Вось да чаго імкнецца сьпісак нумар 46. Дык, сяляне, сьцеражыцеся яго!

Нумар 18 ідзе да таго, каб скасаваць асадніцтва і калянізацыю, каб надзяліць зямлёю усіх беззямельных і малазямельных нашых сялян, каб бараніць наш народ ад усіх яго ворагаў, каб разьвіваць беларускую культуру і пашыраць асьвету, каб адваяваць для беларускага народу тыя правы, якімі карыстаюцца усе вольныя народы.

Вось да чаго ідзе сьпісак нумар 18. Дык, беларусы, Лідзкага вокругу, у нядзелю 25 трауня (мая) усе на выбары з нумарам 18 у руках! Пакажэце, што вы сьведамая беларуская маса, якая хоча для сябе волі і лепшай долі, пакажэце, што вы стойкія ў змаганьні за зямлю і свабоду, што вы хочаце людзьмі звацца.

Дык да перамогі, да лепшай долі!...

Якія нумары сьпіскаў у Лідзкім вокрузе.

Усіх сьпіскаў, прызнаных важнымі пры цяперашніх выбарах у Лідзкім вокрузе, ёсьць 13.

Нумар 2. Спісак ППС. Гэта польская работніцкая партыя, якая апякуецца польскімі работнікамі і згаджаецца на асадніцтва і на калянізацыю беларускіх зямель. Гэта партыя не прызнае уласнасьці на зямлю і да беларусаў адносіцца няпрыхільна.

Нумар 3. „Вызваленьне“. Тое самае вызваленьне, якое на выбарах у 1922 г. ашукала нашае сялянства, узяўшы яго галасы, а за гэта прыслаўшы у падарку асаднікаў. Тады „Вызваленьне“ абяцала і аўтаномію і зямлю і не пастыдалася гэтак ашукаць нашага брата.

Нумар 4. „Бунд“. Спісак жыдоўскі. Ён па сваей праграме падобны да ППС.

Нумар 10—„Стронніцтво хлопске“. Гэта партыя такая самая, як вызваленьне. На вызваленьні ўжо людзі пазналіся, дык яму на зьмену лезе у наш край „Стронніцтво хлопске“. Гэта стронніцтво ведамае з таго, што вельмі моцна стаіць за асадвіцтва на нашых землях і за польскую калянізацыю. Яго правадыр Ян Домбскі, слаўны яшчэ з таго, што у Рызе у 1921 годзе на міравых перагаворах з бальшавікамі падзяліў Беларусь на дзьве часьці: адну аддаў бальшавікам, а другую забраў пад Польшчу.

Нумар 18 — Блёк нацыянальных меншасьцяў. Прыдзержываецца беларускага незалежніцкага кірунку, не ар'ентуецца ні на Маскву, ні на Варшаву, а на свае сілы. Да

сваіх мэтаў ідзе у блёку з іншымі пакрыўджанымі нацыянальнымі меншасьцямі Польшчы.

Нумар 20 — расейская арганізацыя манархістых, якія жадаюць мець цара.

Нумар 25 — польскія эндэкі. Адзначаюцца вялікай ненавісьцяй да беларусаў. Гэтыя кандыдаты, каб прымелі, дык нас жыўцом зьелі-б. За іх стаяць усе польскія ксяндзы, паны і падпанкі.

Нумар 36 — беларуская сялянская партыя працы. На першым мейсцы стаіць адна „паненка" Стэфка Глебавічанка. Чаму яна назвала свой сьпісак беларускім — згадаць трудна. Мусіць затым, што гэта ей карысна. Але і на гэтых выбарах дастане столькі галасоў, сколькі дастала іх на першых — гэта аж 37 галасоў!

Нумар 37 таксама нібы беларускі, сьпісак нейкага Івашкевіча Міхася. І ён выстаўлены, каб разьбіваць беларускія галасы.

Нумар 40—„Стронніцтво людовэ Одродзэньне." Гэты сьпісак слаўны мусіць тым, што ягоны тварэц і галоўны кандыдат Стэфан Міцкевіч ужо блізка два гады як спачывае ў магіле.

Нумар 41 — сьпісак эканома Гэрмана Віктара з Маладэчанскага павету. Чаго гэты эканом хоча для беларускага народу — мы можам лёгка дагадацца.

Нумар 45 — сьпісак спадара Янкі Станкевіча. Аб гэтым сьпіску ужо шмат пісалася. Нашы сяляне ужо добра ведаюць, хто такі Янка Станкевіч і як ён некаторых нашых сялян акалпачыў у 1928 г. Цяпер ужо гэтага ня будзе.

Нумар 46 — Беларускі Сялянска работніцкі клюб з былым паслом Валынцам на чале. Гэты сьпісак прыносе нашаму народу камісарскі прыгон, камуну і зьдзек над рэлігіяй. Сам Валынец слаўны з таго, што як толькі бяда—дык ён уцякае за граніцу, пакідаючы сваіх прыхільнікаў у турмах. Быў ён уцёкшы перад выбарамі у 1928 г., уцёк і цяпер. Гэты сьпісак ведамы таксама і з таго, што пры помачы правакацыі заганяе у турмы нашых сялян. Дык ніводнага голасу тым, якія сваю скуру хаваюць аж за граніцай!

ГРАМАДЗЯНЕ!

Прысылайце падпіску на «Беларускую Крыніцу».

Нашыя першыя кандыдаты сьпіску нумар 18.

Більдзюкевіч Адам. Родам з Радашкавіч, Маладэчанскага пав. Скончыў гандлёвую акадэмію, быў праз доўгі час сэкрэтаром беларускага Пасольскага Клюбу, шмат пісаў інтэрпэляцыяў да польскага ўраду, баронячы нашых сялян, быў старшынёю і галоўным закладчыкам Беларускага Інстытуту Гаспадаркі і Культуры, вёў ладжаныя Інстытутам беларускія кооператыўна—гандлёвыя курсы, напісаў кніжку — „Асновы грамадзкай гаспадаркі", ніколі ня здрадзіў інтарэсаў беларускага народу і паміма цяжкіх жыцьцёвых варункаў, не пайшоў да сільных гэтага сьвету, як гэта зрабіў Янка Станкевіч.

Пазьняк Янка — сялянскі сын, Лідзкага павету, Суботніцкай гміны. Шырока ведамы беларускі народны дзеяч. На ніве беларускай вытрывала працуе ад 1917 г. У гэтым часе ў Вялейскім павеце ён арганізуе беларускую моладзь, закладае аматарскі беларускі тэатр, які разьяжджае па ўсім павеце і шырока нясе асьвету і беларускую народную сьведамасьць.

У тым-жа часе Янка Пазьняк быў вучыцелем у Будслаўскай беларускай гімназіі.

Ад 1919 ён працуе ў павеце Ашмянскім. Тут за беларускую працу польскія ўладу арыштавалі яго і пасадзілі ў вастрог, а звольніўшы, трымалі пад надзорам жандармэрыі 8 месяцаў.

У 1920 г. калі ў край наш былі прышоўшы бальшавікі, на зьездзе сялянскім у Ашмяне Я. Пазьняк дамагаецца выхаду бальшавікоў, каб даць магчымасьць беларусам узяць свой лёс у свае ўласныя рукі.

Ад 1925 г. пачынае беларускую народную і грамадзкую працу ў пав. Віленска-Троцкім, асабліва ў гмінным самаўрадзе, Міцкунскай гміны, Рада якой, бяручы пад увагу заслугі Я. Пазьняка для сялянства, надзяліла яго тытулам ганаровага грамадзяніна тэйжа гміны.

Ад 1928 г. Я Пазьняк прабывае ў Вільні, дзе спаўняе небясьпечныя абавязкі рэдактара „Беларускай Крыніцы". За гэтую працу ўжо мае аж некульні палітычных судовых спраў.

Як знаўца самаўрадаў, напісаў пабеларуску брашуру аб гмінных самаўрадах.

Чэрніхаў — знаны ў Вільні адвакат, жыд, трэці каннылат на сьпіску нумар 18, свайго мандату зрокся на карысьць беларусаў. Зрачэньне яго ў сваім часе было абвешчана ў газэтах.

Малец Ян — чацьверты кандыдат, сялянскі сын Лідзкага пав., народны вучыцель.

З беларускага жыцьця.

Суд над рэдактарам „Шляху Моладзі" М. Пяцюкевічам і выдаўцом Я. Багдановічам. 12 г. м. Акружны Суд у Вільні разглядаў судовую справу рэдактара М. Пяцюкевіча і выд. Я. Багдановіча за канфіскату № 8 „Шляху Моладзі", абвінавачаных па 132 арт. К. К. Суд, разгледзеўшы справу, абвінавачаных зусім апраўдаў. Справу бараніў ведомы ў Вільні адвакат Браніслаў Аляхновіч.

Матуральныя экзаміны ў Віл. Бел. Гімназіі. 7 г. м. пачаліся пісьменныя экзаміны ў Віленскай Беларускай Гімназіі. Да экзаменаў прыступіла 27 асобаў. У гэтым ліку здаюць вучні Віленскай Бел. Гімн., Клецкай Бел. Гімн. і некалькі экстэрнаў. Старшынёй экзаменацыйнай камісі вызначаны Віл. Куратарам п. Нарвойш, дырэктар польскай гімн. ім. Ю. Славацкага ў Вільні.

Украінскія паслы на помач 18. На днях прыехалі са Львова украінскія паслы незалежніцкага кірунку дзеля агітацыі за № 18 сярод нашага сялянства. Ужо зладзілі некалькі прадвыбарчых мітынгаў і надалей застаюцца тут дзеля прадвыбарчай працы. Як бачым, нават нашыя браты ўкраінцы стараюцца, каб мы маглі больш правясьці ў польскі Сойм сваіх людзей, якія будуць абстайваць нашы беларускія справы.

Аб агульным сходзе сяброў Бел. Студ. Саюзу. Агульны сход сяброў Б.С.С. у гэтым годзе адбыўся 11 г. м. даволі бурна. Шмат абгаварывалася рожных пунктаў. Між іншым быў прадстаўлены рэгулямін-інструкцыя працы ў БСС. Дзеля разгляду гэтага рэгуляміну створана спэцыяльная камісія з трох асобаў студэнтаў праўнікаў.

У склад Ураду БСС увайшлі—старшыня: К. Глінскі, Станіслаў Станкевіч, Сяргей Сарока, М. Зянюкова, З. Каўшанка, А. Бартуль і С. Жураўлёў.

У Рэвізыйную Камісію ўвайшлі: М. Шкялёнак, М. Тулейка і А. Гаўрылічанка.

З незалежніцкага і радыкальнага кірунку ніводзен студэнт ні ў Урад, ні ў Рэвізыйную Камісію БСС уступіць не згадзіліся.

М. Пяцюкевіч.

Беларускія народныя песьні

з вёскі Цяцерак, пав. Браслаўскага.

(Запісаў М. Пяцюкевіч у Ганны і Юлькі Пяцюкевічыхаў і Ядвісі Гашчэнкавай.

УВАГА! Гэтыя песьні запісаныя так, як диктавалі ўспомненыя асобы, ці інакш кажучы — запісаныя ў мове Браслаўшчыны.

ПЯТРОЎСКІЯ.

Пятрова Ночка.

Пятрова ночка невялічка,
Ой, то, то.
Я маладзенька ня выспалася,
Ой, то, то.
Рутанька мая зялёная,
Ой, то, то.
Сьвякрованька мая шалёная,
Ой, то, то.
Загадала мне ў нядзельку рабіці,
Ой, то, то.
Дзежку жлукціць, на моры бяліць,
Ой, то, то.
Верх лесу сушыць, па небі качаць,
Ой, то, то.
Ды у арэшак складаць,
Ой, то то.
Я маладзенька ўмела адказаць,
Ой, то, то.
Я ві жыдоўка ў нядзельку рабіць,
Ой, то, то.
Я ня вутанька па моры плываць,
Ой, то, то.
Я ві зязюля верх лесу лятаць,
Ой, то, то.
Я ні вавёрка ў арэшак складаць,
Ой, то, то.
Я ня сонійка па небі качаць,
Ой, то, то,

Ды хадзіла.

Ды хадзіла каралёва жана
Па чыстаму полю,
Ды хадзіла.
Ды насіла каралёва жана
Малога дзіця,
Ды насіла.
Ды прасіла каралёва жана
У Госпада Бога,
Ды прасіла.
Ды дай Божа, каб майго караля
На вайне забілі,
Ды дай Божа.
Ды каб тады я малада
За другога вышла,
Ды, каб тады.

Лiтала паванька.

(Талачаная).

Лiтала паванька ў саду, па саду,
Раніла перыйка ў зялёну траву.
Ні жаль мне павы, ні пер'я яе,
А жаль мне сястрыцы ў чужой старане.
Цяжанька рыбаньцы біз вады жыць,
Так мне маладой біз радні быць.
Ды выйду на вулачку—гуляю, гуляю,
Прыду я да домачку — думаю, думаю;
Ўся чужая сямейчка—вескім гаварыць:
Ляжыць мілы на пасьцелі—ня сьмею будзіць.
Сьвекарка ня любіць, што я п'яніца,
Мілінькі ня любіць, што я ніўдаліца.

ЖНІЎНЫЯ

Раёк.

Ішоў раёк дарогаю шырокаю.
Ідзі раёк у наш дварок:
Нашы двары мяцёныя,
Нашы сады саджоныя,
Нашы сталы засланыя,
Нашы хлябы сітовыя,
Нашы мяды салодкія.
Выйдзі паня, ві хавайся,
Па пакоях ні туляйся.
Прышлі жнеі, ні жаўнеры —
Ні на вайне ваівалі
Жнеі з поля сабіралі.

Пірапёлка.

Рада, рада шэра пірапёлка,
Што лета дажлала.
Рада, рада!
Рада, рада наша гаспадынька,
Што жыта дажала.
Рада, рада!
Ды ці вышла цёмная туча
З пад цёмнага лесу.
Ды ці вышла!
Ды ня вышла, ды цёмная туча
З пад цёмнага лесу.
Ды ня вышла.
Ды выслала буйнага ветру, —
Дробнага дожджу,
Ды выслала!
Ды ня вышла наша гаспадынька
Ніразу на ніўку.
Ды ня вышла!
Ды выслала сем сынкоў—сакалкоў —
Дочак пірапёлак.
Ды выслала!

З Польшчы.

Пасьля выбараў у шлёнскі Сойм. Як ведама, найбагацейшая ў Польшчы аўтономная правінцыя Шлёнск або Сілезія мае свой асобны Сойм у Катовіцах. На днях адбыліся там выбары ў свой краёвы Сойм. На выбарах, як і трэба было спадзявацца, санацыйны, гэта знача ўрадовы лагер, пацярпеў паважныя страты, бо на 48 мандатаў шлёнскага Сойму атрымаў толькі 10. Сталася гэта ня гледзячы на выбарны тэрор з боку розных санацыйных баёвак. З гэтага відаць, што на ўплывы санацыйныя надыходзе зьмярканьне ня толькі на нашых землях, але таксама і на захадзе Польшчы. Можна асабліва цяпер дагадацца, чаму гэта на выбарах у Сойм па вокругах лідзкім, сьвянцянскім, луцкім, ковэльскім і сандамерскім урадавая партыя зьняла сваю „адзінку.“

Але выбары ў шлёнскі Сойм маюць для беларусаў яшчэ адну павучальную старану: Немцаў, што калісь ставрылі такі багаты промысел у гэным краі, жывуць цяпер пад Польшчай у мала лепшых палітычных варунках, чымся мы Беларусы. Гэта прымушае Немцаў усюды арганізавана змагацца за свае правы. Вось калі надышлі выбары— ні адзін Немец ня ўстрымаўся ад галасаваньня, а галасаваў на свой нямецкі сьпісак. Дзякуючы гэтаму было пададзена 179 тысяч нямецкіх галасоў. Такім чынам атрымалі яны ў шлёнскім Сойме 15 мандатаў.

Няхай-жа будзе гэта і для нас прыкладам пры цяперашніх дадатковых выбарах у варшаўскі Сойм.

З заграніцы.

Новыя ордэны ў саветах. Дагэтуль у саветах былі толькі два ардэны: ордэн чырвонага сьцягу, які даваўся за ваенныя заслугі і ордэн чырвонага сьцягу працы, якім адзначалі за заслугі камуністычныя. Цяперка ўстанавілі яшчэ два ардэны: ордэн Леніна і ордэн чырвонай зьвязды. Першы даецца за заслугі на полі прамысловасьці і сялянскай гаспадаркі, а другі за малыя заслугі на полі вайсковага будаўніцтва. Як бачым, камуністы скора будуць падобны да царскіх урадоўцаў: усе грудзі у ардэнах! Толькі замест белага — усе чырвонае.

Вызваленчы рух у Індыі. Рух процію англійскага ўціску ў Індыі набірае з кожным днём большай сілы. На днях у Шляльпур распачаўся вялікі палітычны працэс проціў аднаго з памацнікоў Ганді — Тыабьі і яго 59 прыхільнікаў. Тыабьі выразіў здзіўленьне, што яго арыштавалі і прызнаўся, што імкнецца вызваліцца ад Англіі, якая ужо 150 гадоў нішчыць Індыю дзеля ўласных гаспадарчых карысьцяў.

Ёсьць весткі, што паўстанцы ужо былі захапіўшы места Шляльпур, але англійскія войскі, ня гледзячы на вялікі опрацію, здалелі адабраць назад гэта места, пасьля чаго арыштавана 80 чалавек з пасярод сяброў нацыянальнага конгрэсу і аб'яўлена ваеннае палажэньне. У бюрах мясцовых кангрэсаў зроблены рэвізіі і забраны ўсе паперы. Забаронена насіць аружжа і навет палкі.

З краю.

Пажары нішчаць нашу вёску. На днях здарыўся страшны выпадак пажару ў калёніі Чарневічы, Дзісненскага пав.

Апрача вялікіх стратаў матэр'яльных ёсьць 5 ахвяр з людзей. Агонь так хутка ахапіў памешканьне, што сям'я Адольфы Саломы не змагла уцячы і дзеля гэтага тры асобы памёрлі зараз-жа, а дзьве ў цяжкім стане завезены да шпіталю ў Дзісну.

— У павеце Пастаўскім згарэлі два гумны, належачыя да Лыпёнкаў з Дубровы, 6 ha лесу М. Жалабоўскай з в. Цішачы і каля в. Чарты згарэла 9 ha лесу.

— У Ашмянштчыне ў ваколіцы Ваўкоўшчыны згарэла палова дому і сьвіран Ст. Дармаковай вартасьці 4.000 зл., а ў самай Ашмяне згарэла гумно з інвэнтарам Д. Ф. Дубковых, якія страту ацэньваюць на 8 000 зл.

— У Вялейскім пав. у в. Дамanове згарэла хата з усей абстаноўкай М. Барачэўскага вартасьці 4.000 зл.

Знойдзены труп. На дарозе не далёка ад м. Опса пав. Браслаўскага знойдзены труп. Ігн. Ляскоўскага, жыхара в. Кубелеўшчына, Нова-Пагоскай вол., Браслаўскага пав. На целе сьцьверджана рана ад падстрэлу у грудзі. Недалёка ад трупа ляжаў карабін (адразанка).

Усячына.

Шаранча ў Мароко паявілася ў такой колькасьці, што быў выпадак, калі адна хмара шаранчы села на жалезную дарогу, дык цягнік з Танжэру да Фэзу ня мог ніяк праехаць і мусіў затрымацца так доўга, пакуль не прыбылі спэцыяльныя машыны для расчысткі.

Як доўга ідзе пісьмо навокала сьвету. Адзін жыхар места Харбіна кінуў у скрынку ліст заадрэсаваны ў Амэрыку на выдуманы адрас. На гэным пісьме ён зазначыў, што на выпадак, калі-б пісьмо не знайшло адрэсата ў Амэрыцы, то просіць, каб ліст вярнулі назад да Харбіну, але праз Францыю, Нямеччыну і СССР.

Такім чынам ліст зрабіў дарогу на вакола сьвету і вярнуўся ў рукі высылача праз 4 месяцы і 11 дзён.

Перадгістарычныя раскопы на Валыні. Прафэсар Гофман з Роўнага адкрыў каля Астрога ў аднэй магіле некалькі гліняных пасудзін, крэмянявую сякеру, косьці і сьляды вогнішча. Знаткі цьвярдзяць, што гэтыя выкапаныя рэчы паходзяць з 1800 году перад Хрыстом.

М. Горкій вяртаецца ў Саветы. З Мілану паведамляюць, што вядомы расейскі пісьменьнік Максім Горкій маецца пры качцы чэрвеня вярнуцца ў СССР. Перш паедзе ў Ленінград, а пасьля будзе пражываць стала ў Маскве.

Чытайце і пашырайце «Беларускую Крыніцу»!

Галасуйце за № 18.

На № 18 галасуюць усе Беларусы, гэта знача ўсе, што жывуць на нашых землях пад вясковай саламаннай страхой, церпяць нядолю, зьдзек, безьзямельле. На гэты нумар галасуе кожны чэсны сын свэй многапакутнай бацькаўшчыны, бо на гэтым нумары стаяць нашы людзі, што вышлі з народу і будуць яго бараніць!

Не галасуе зусім кожны труцень і пячурнік, што седзячы на печы чакае, аж нехта другі для яго добра зробіць!

УВАГА! калі ня маеш друкаванага № 18 — напішы яго сам на чыстай белай картачцы!

Жніця, жніця, вы сынкі—сакалкі —
Дочкі пірапёлкі.
Жніця, жніця!
Што знайдзеце ў жыце, з сабой вазьміце—
Вазьміце усё
Што знайдзеце!
Ды выкачу вам восем бочак віна,
Дзівятую мёду.
Ды выкачу вам!

Пайду я лужком.

Ды пайду я лужком-беражком,
Калінавым мостам,
Ды пайду.
Ды пайду я крута-віта дзераўка,
Зялёнае лісьця.
Ды пайду.
Ды нашто-ж мне крута-віта дзераўка,
Зялёная лісьця;
Ды нашто-ж мне?
Ёсьць у мяне, мой сьвёкарка ў доме,
Як мядзьведзька у ломі.
Ды ёсьць у мяне.
Ды пайду я лужком-беражком і г. д.*)
Ёсьць у мяне татулька у домі,
Як пчалочка ў мёдзі.
Ёсьць у мяне.
Ды пайду я лужком-беражком і г. д.

Кругла—мало.
(Дажынаючы жыта).

I.

Кругла-мало, кругла-мало балоцітка,
Ды хоць яно, ды хоць яно кругла-мало,
Калі яно, калі яно шчасьлівая.
Наляцела, наляцела поўна гусей;
Ня ўсе гусі, ня ўсе гусі—ёсьць лябедзі
Ня ўсе шэры, ня ўсе шэры, ёсьць і белы.

II.

Кругло-мало, кругло-мало, балоцітка,
Хоць яно кругло, хоць яно кругло-мало,
Калі яно, калі яно шчасьлівая.
Нізка-мала, нізка-мала Марысінька,
Хоць яна, хоць яна візінька,
Калі яна, калі яна шчасьліва.
Наехала, наехала поўна сватоў;
Ня ўсе сваты, ня ўсе сваты,—ёсьці сваціцы.

Вячэрнія зара.

Вячэрнія зара цёмна,
Дваранiна жана чорна.
Раньнія зара ясна,
Сіляніна жана красна.
„Сіляніну, сілявіну!
Будзім жонак міняці:
Дам табе прыдатачку:
Ковіка варанога
І сядзёлка залатоя.“
Ні хачу прыдатку браць,
Ня буду жонку міняць.
„А я хоць у бяду упаду,
Сіляніну жонку украду.“
„А я хоць павалюся,
За жонкай пагаюся!“

Дзевачка-сіротачка.

Дзевачка сіротачка,
За борам жыта жала,
З совійкам размаўляла:
„Гора маё горайка,
Жаль маю на совійка,
Чаго яно рана ўсходзіць —
Пазьнюсінька заходзіць.“
Дзевачка—сіротачка,
Ні жалься на сонійка,
Ні жалься на горайка:
Яно рана прабуджаіць —
Позьненька ўкладаіць.

Узыйду на горачку.

Узыйду на горачку,
Плясну ў далоначкі.
Ці звонкі далонкі —
Залатыя пярсьцёнкі?
Ды зачуў мой свёкарка,
Ды зачуў мой татачка, —
„Памалу нявестухна,
Памалу дзіцятухна:
Ні пабі далоначкаў,
Ні ламай пяр ьцёначкаў.“
Мае ня сьвёкарка спраўляў,
Ды мне татулька купляў!
(д. б.)

*) Першы, другі і трэці куплеты паўтараюцца.

Нядаўна выйшла з друку і паступіла ў прадажу кніжка п. н.

„Smyk biełaruski“

Фр. Багушэвіча,

юбілейнае і папраўленае выданьне Бел. Інстытуту Г. і К. Кніжка гэта зьмяшчае вельмі прыгожыя вершы Бацькі беларускага адраджэньня, якім ёсьць Фр. Багушэвіч, кніжка **каштуе 60 гр.** Купіць можна ў ва-ўсіх беларускіх кнігарнях. Галоўны склад: кнігарня „Пагоня“, Вільня, Людвісарская вул. № 1.

Да нас пішуць.

ЯК КАНДЫДАТЫ Ў ПАСЛЫ ЯНКА І МІШКА СТАНКЕВІЧЫ ЗАЙМАЛІСЯ „ФОТОГРАФІЯЙ.“

Юрацiская гміна, Лідзкі пав. У № 17 газэты „Наперад“ хваліць Янка Станкевіч сваіх кандыдатаў у паслы. Але калі хто раз ашукаў, то другі раз ніхто яму не павера.

Было гэта так: у 1928 г. была скасавана наша восемнастка. Дык куды кінуцца? Да Паўлюкевіча брыдка, а Янка Станкевіч так сябе расхваліў, што проста залез у душу. Цяперашні кандыдат з № 45 Мішка Станкевіч тым толькі і ведамы у нашай гміне, што езьдзіў па Вялейскім павеце і аб Янку казаў: „як ён гавора, то ўсе людзі плачуць,“ А знача заплача увесь Сойм, заплачуць эндэкі, заплача уся Польшча над нашым горам, як „золатавусны“ Янка загавора. І запраўды плакалі, але паслухайце хто і ад чаго.

Мішка Станкевіч раз прывёз да нас Янкавы нумары. Мы развазілі. На памятку гэтай „гістарычнай“ падзеі зробім — кажа Мішка — фотографію ў Вільні.

Едзе гэта ў Вільню Антон Біль, Барысэвіч і я. Кошты падарожы мелі нам быць зьвернены. Прыяжджаем, значыцца, да „самога“ Янкі Спадара, а ён нас пытае „чаго вам“? — „вы-ж нас—кажам—прасілі здымацца, толькі чаму-ж гэта Мішка Станкевіч ня прыехаў, ці ён з намі ня хоча быць на фотографіі?“ Тут Янка завярнуў плячом нейкага крывуля і кажа: „вы мне просьбе выбараў не патрэбны.“

І прышлося нам цярабіць галодным 80 вёрст піхатой. Успомнілі мы словы Мішкі аб тых сьлёзных прамовах Янкі і самі горка заплакалі. Каштавала нам гэта фотографія дорага, але нічога ня зробіш. Нічога на сьвеце не даецца дарма, асабліва навука. Цяпер мы ужо ведаем, што за людзі стаяць на сьпіску № 45.

Кастусь Сьветавастокаў.
ф. Ярасьмішкі.

ВЫПІВАЛЬНА-ТАНЦАВАЛЬНЫ СПЭКТАКЛЬ НЯ ЎДАЎСЯ.

Мураваная Ашмянка, Ашмянскага пав. Ведама ўсім, што на нашых землях за шмат паліцыі. Дык няма дзіва, што наша паліцыя ня мае ніякай работы. На Вяліюдзень наш пан камандант знудзіўся і пастанавіў зладзіць вечарыну.

А дзеля таго, што гэты пан любіць лучыць прыемнае з карысным для сябе—уваход быў па білетах. Мужчыны паўтары зал. жанчыны 1 зл. Але як на злосьць пану коменданту запрошаныя шляхтуны зусім згалелі і ня мелі на білет ані зламанай залатоўкі. Усё гатова, а публікі няма. Што рабіць? Прышлося запрашаць звычайных сьмяротных, гэта знача нашых Беларусаў. Нашлося пара таўкачоў, што любяць як іх паліцыя часам дзеля сьвята назаве „панам.“ Тыя і пайшлі. Але затое ўсе іншыя хлопцы ўзялі гармонік і пашлі сабе ў іншую хату скакаць.

Не спадабалася гэта танцавальная конкурэнцыя каманданту пастарунку. Як ня як ён сваю гульню дый да нас: „kto śmie urządzać tańce? pozwolenie jest?“ Тут ён пачаў страшыць пратаколам і ўсіх разагнаў. Малышка прышоў паглядзець, ці няма ў хаце жонкі, дык камэндант яго і ня пусьціў.

А можа вы, чытачы, падумаеце, што камандант пастарунку ў той нанятай ім хаце ладзіў вейкае прадстаўленьне? Але-ж дзе там! Аказалася, што там быў прыведзены Маркоўскі з выпіўкай і закускай, каб патанцаваўшы было чым развесяліцца.

Можна паліцыянтам па свойму разумець культурную працу на вёсцы, але разганяць танцы толькі дзеля таго, каб прадаць больш білетаў—гэта і незаконна і сьмешна.

Ч.

ЦЁМНЫЯ СІЛЫ ПЕРАМОЖАМ!

Друя, Браслаўскі пав. Чалавеку прывыкшаму праз чорныя акуляры на сьвет і здарэньні глядзець — здавалася-б, што у нашай Друйшчыне на горшае ідзе. Слушна маглі мы пахваліцца прад другімі парахвіямі такім здабыткам, як беларускія казаньні у касьцеле нашым. Цяпер выплылі знекуль на белы сьвет цёмныя сілы, што дагэтуль неяк дзесь захаваўшысь ціхай сядзелі — і заграшілі авантурай у касьцеле, калі-б беларускія казаньні далей гаварыліся. Ці ксяндзы нашы паверылі ў выкананьне гэтае пагрозы, ці на гэтыя чорныя сілы і рады няма, ці да гэтага далучыліся і другія якія прычыны — даволі таго, што слова Божага у вопратцы беларускай ужо другі месяц ня чуем у касьцеле. Ці цяпер глухая на амбоне па нешпарах. Няма беларускага — ня трэба нам і польскага казаньня! І мы спадзяёмся, што пробашч не захоча рабіць прыкрасьці нам і сабе, гаворачы ці пазваляючы другому каму гаварыць казаньне па нешпарах папольску. А гэты паход цёмных сілаў пабудзіў нас ня толькі бараніць таго, што маем, але яшчэ дамагацца, што слушна нам належыцца—дамагацца беларускага казаньня на Суме. Выпадак гэты, спыненьне казаньняў у роднай мове мусе зьяднаць нас у дружную грамаду — а ў змаганьні гэтым прыкладам будуць нам служыць слаўныя Жодзішкі!

В. Б.

Чаго ня можна ліцытаваць?

Дзеля таго, што часта бываюць непаразуменьні з прычыны ліцытацыяў праз каморнікаў, улады судовыя ў спэцыяльным пісьме падалі, што трэба старанна заховываць адпаведнае права, каторае прадбачыць, што ліцытацыі не падлягаюць:

1) часьці вопраткі (адзежы), бялье, лыжкі, хатняя абстаноўка і кухонная, служачая да сагравальня і варэньня (гатаваньня), а таксама рэчы да адпаведнага ўтрыманьня дому.

2) прадукты да пражыўленьня і апал на працяг двух тыдняў, або гатоўка патрэбная на куплю іх.

3) адна дойная карова або дзьве казы з патрэбным пошарам і подсьцілкай дзеля пракармленьня на працяг чатырох тыдняў.

4) у земляробаў, артыстаў, рамесьнікаў і работнікаў прамысловых — прылады патрэбныя да выконваньня фаховых занятнкаў.

5) у ахвіцэраў, урадоўцаў, вучыцялёў, дахтароў, акушэрак, адвакатаў і натарыюшаў — прадметы да выконваньня сваей працы, і адна прызваітая вопратка.

У выпадку, калі занятыя (забраныя) прадметы не належаць да даўжніка, мусіць ён зажадаць ад экзэкутара запратакалаваньня адпаведнага свайго заяўленьня, а ў разе яго адмовы, мусіць ад гэтым заведаміць улады, па распараджэньні якой зроблена экзэкуцыя.

Тэрмін першай ліцытацыі ня можа быць вызначаны раней як за тры тыдні ад дня забраньня інвэнтару.

Наша пошта.

Янку Лукшу ў Францыі. Вельмі нас цешыць, што Вы не забываеце на „Бел. Крыніцу“, будучы на чужыне. Рэдакцыя ахвотна зьмяшчала-б карэспондэнцыі з Францыі аб жыцьці нашых эмігрантаў, калі-б Вы былі ласкавы аб гэтым пісаць. Просьбу Вашу спаўняем.

К. Сьветавастокаву. З прысланага карыстаем — дзякуем.

Прыхаджаніну: З корэспондэнцыі па магчымасьці скарыстаем, просьбу споўнім.

Ю. Сабалеўскаму: Просьбу Вашу спаўняем. Пераклады будзем друкаваць.

Гучнаму: Верш Ваш разгледзім, калі падойдзе да друку—выдрукуем.

П. Скрэнтнаму: Праўную параду дамо.

П. Юралевічу: Газэта пасылаецца Вам акуратна, дамагайцеся на пошце.

Грошы атрымалі ад: Г. Арачка 3 зл., Анд. Пазьняка 6 зл., К. Давыдчыка 1 зл., Ю. Шутовіча 4 зл., і Эдв. Падгайскага 2 злоты.

Да ведама выбаршчыкаў.

Трэба ведаць, што ў перадвыбарным часе, зн. у часе ад абвешчаньня выбараў да галасаваньня, на зборкі ў справе выбараў 1) у закрытым памяшчэньню (у хаце, гародзе, панадворку) ніякага дазваленьня ня трэба, а таксама ня трэба жадных заяваў. 2) на зборкі аткрытыя (на вуліцы, рынку) трэба заявіць найбліжэйшы пастарунак паліцыі за 24 гадз. да зборкі.

Куток сьмеху.

Старыя песьні на новы лад.

БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІ САНАЦЫЙНЫ ГІМН.

Мы выйдзем шчыльнымі радамі
Паганіць родны свой прастор,
Паб'ём усіх, хто ня йдзе з намі,
А Янку мы дамо тапор.
Хай ажыве закамянелы
Наш санацыйны поўны брух;
Поўны брух штандар наш заплясьнелы
Сымболізуе гэты рух,
Браты, к карыту мы падходзім,
Грызі, кусай як наймацней,
А як усім мы ўжо нашкодзім —
Чакае нас капшук грашэй.

Іншая песьня санатара.

Ой пайду я лугам, лугам,
Пакланюся панскім слугам (біс)

* * *

Папрашу я ў пана есьці,
На Лукішках каб ня сесьці. (біс)

* * *

І наеўся і напіўся,
Сеў і вельмі засмуціўся. (біс)

* * *

Засмуціўся — няма рады,
Бо ня стравіш сваей здрады. (біс)

Лякарня Літоўскага
Т-ва
Санітарнае Помачы
ў Вільні, Віленская вул. 28.

Прыймаюць дахтары спэцыялісты.—Адбываюцца ўсялякага роду опэрацыі. У лякарні аддзелы: унутраны, хірургічны, гінэколёгічны і радзільны.

Кабінэт Рэнтгэна і электра-мэдычны
Лячэньне праменьнямі, фатаграфаваньне, прасьвятляньне, электрычны масаж.

Прыймо ад гадз. 10 р. да 4 па пал.
Незаможным уступка.

Хутка выйдзе з друку
Каталёг
кнігарні „ПАГОНЯ“

Каталёг высылаецца безплатна.
Заказы можна прысылаць ужо:

WILNIA,
Biel. Kniharnia „Pahonia“, Ludwisarskaja 1.

Рэдактар Янка Пазьняк. Бел. Дрк. ім. Фр. Скарыны Вільня, Завальная 6—10. Выдавец Альбін Стэповіч